# Падтрымка талентаў дзеля вялікіх перамог

У Нацыянальным алімпійскім камітэце адбылася цырымонія ўручэння імянных пасведчанняў перспектыўным спартсменам і трэнерам

**На гэты раз рэкордная колькасць маладых атлетаў стане стыпендыятамі рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб». З 210 атлетаў, якія ўвайшлі ў спіс, 178 былі пераможцамі і прызёрамі чэмпіянатаў свету і Еўропы, Кубкаў свету і Еўропы ў 2017 годзе.**



Найбольш значных поспехаў дабіліся Хрысціна Стараселец і Таццяна Клімовіч (веславанне акадэмічнае), якія перамаглі на чэмпіянаце свету і Еўропы сярод моладзі. Адзначым, што ўпершыню ў лік стыпендыятаў увайшла зборная Беларусі па валейболе да 18 гадоў, якая заняла 3-е месца на чэмпіянаце Еўропы ў Нідэрландах. Дзюдаіст Даніэль Мукеце стаў найлепшым на кантынентальным першынстве, агульны залік Кубка свету ў трэкавай дысцыпліне скрэтч выйграў веласіпедыст Яўген Каралёк.

У ліку стыпендыятаў таксама прадстаўнікі біятлона, канькабежнага спорту, фрыстайлу, што сімвалічна напярэдадні зімовай Алімпіяды. Дарэчы, упершыню ў спісе стыпендыятаў прадстаўлены і сноўборд.

*— Да зімовай Алімпіяды ў Рэспубліцы Карэя застаецца менш за два месяцы. Авангард беларускага спартыўнага руху выходзіць на фінішную прамую падрыхтоўкі да галоўных стартаў чатырохгоддзя, а мы будзем рыхтаваць вядучым атлетам годную змену,* — адзначыў **старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.** *— Большасць прысутных атлетаў з'яўляецца пераможцамі або прызёрамі розных буйных міжнародных спаборніцтваў. Гэта новая вышыня, якая сведчыць не толькі аб колькасці, але і аб якасці падрыхтоўкі маладых спартсменаў.*

Дзмітрый Лукашэнка пажадаў маладым атлетам максімальна выкарыстоўваць свой талент і адзначыў, што стыпендыі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — гэта не вынік, а толькі адна з прыступак на цяжкім і доўгім шляху ў вялікі спорт. У цырымоніі ўручэння імянных стыпендый таксама прынялі ўдзел першы віцэ-прэзідэнт НАК Андрэй Асташэвіч і намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл Партной. Сярэдні памер стыпендыі атлетам складзе BYN7143 у год, трэнерам — BYN7600 у год, фінансавая падтрымка будзе ажыццяўляцца на працягу ўсяго 2018 года.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# Лямус: ад склепа да музея

## У самым старажытным на Беларусі драўляным будынку размесціцца выставачная экспазіцыя

**Унікальны помнік архітэктуры знаходзіцца ў дворыку былога Брыгіцкага манастыра і датуецца другой паловай XVIII стагоддзя. Зараз тут вядуцца работы па яго кансервацыі. Пасля цэлага комплексу аднаўленчых мерапрыемстваў старажытны лямус будзе даступны для гараджан і турыстаў.**



Можна сказаць, што работы пачаліся своечасова, бо фундамент прасеў і двухпавярховы драўляны будынак пачаў нахіляцца набок. Таму ў першую чаргу заняліся гэтай праблемай. Было яшчэ некалькі абцяжваючых абставін, кажа **навуковы кіраўнік аб'екта, архітэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Алена ШЧАСНАЯ.** Напярэдадні разабралі цагляныя коміны, унутраныя перагародкі і пашкоджаныя бэлькі перакрыцця, якія надавалі будынку прасторавую жорсткасць. Да таго ж і некаторыя кроквы на вуглах былі пагнілыя.

— Трэба было выраўняць лямус так, каб ён не абваліўся, — кажа Алена Шчасная, — улічваць яшчэ і вугал страхі, а яна па вышыні амаль 5 метраў. Таму задзейнічалі адразу шэсць дамкратаў, адзін з якіх не вытрымаў цяжару і зламаўся. Будынак практычна візеў у паветры, але гэта было патрэбна для выканання бутавага падмурка і замены ніжняга шэрагу брусоў, пашкоджаных гніллю і спарахнелых на вуглах.

Пасля таго, як падвялі падмурак, заняліся сценамі. Каркас з абодвух бакоў замацавалі вертыкальнымі брусамі, каб выцягнуць яго і выраўняць. Такі страхавы пояс засцерагае сцяну ад нераўнамернага ўсаджвання. Ён часовы — праз некаторы тэрмін яго здымуць. Заменены брусы з часам набудуць такі ж серабрыста-шэры колер, як і ўвесь будынак. Шчыліны на наступны год будуць замазаны смалой з апілкамі. Лямус нядрэнна захаваўся, хоць і прастаяў больш за 200 гадоў, — лічаць архітэктары.

Цікава, што драўляныя лямусы будаваліся без металічных матэрыялаў. Праўда, на працягу існавання будынка яго ўзмацнялі цвікамі і скобамі. Калі яны з'явіліся — невядома. Рэстаўрацыя таксама без гэтага не абыдзецца, бо сцены трэба замацаваць як след. Потым лішнія цвікі прыбяруць. А вось металічныя пруты пад падлогай і паміж паверхамі застануцца, але іх не будзе відаць.

— Прыходзіцца ратаваць будынак усімі магчымымі спосабамі, — прызнаецца Алена Шчасная, — прымяняць сучасныя тэхналогіі, дзе патрэбна. Раней такіх не было, можа і не спадзяваліся гэта будаўнікі, што звычайная гаспадарчая пабудова праcтаіць некалькі стагоддзяў...

Такі вялікі драўляны лямус у Гродне — адзіны ў краіне, адзначае **загадчык кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў БНТУ, прафесар Сяргей СЕРГАЧОЎ.** Хоць некалі іх было шмат у Заходняй Беларусі, асабліва на Піншчыне. Удакі прыгожы лямус у Ашмянскім раёне. Яшчэ адзін захаваўся на былой сядзібе Міцкевічаў у Баранавічах. Слова «лямус» нямецкага паходжання і перакладаецца як «домік з гліны». Пабудова мела гаспадарчае прызначэнне, там захоўваліся прадукты, прылады працы, збожжа, а на другім паверсе маглі жыць работнікі. Будаваліся лямусы на панскіх альбо манастырскіх сядзібах, звычайна ў паркавай зоне, таму мелі прыгожае аздабленне балюстрадамі, галерэямі, аркамі, лоджыямі, калонамі. У драўляных канструкцыях ёсць свая логіка і прыгажосць, падкрэслівае Сяргей Сергачоў.

Лямус у Гродне стаяў запусцелы каля 30 гадоў. Нейкі час ён быў прыстасаваны пад жытло, аб чым сведчыць печ. Верагодна, яе дабудавалі пасля адыходу адсюль манахінь у 50-я гады.

Налета плануецца завяршыць рамонтныя работы. Новы выгляд дэталяў будзе максімальна набліжаны да арыгінала — вокны, дзверы, падлога. Гэта будзе карпатлівая праца, і ўжо ёсць дамоўленасць з майстрам, які гэта зробіць. Нават дах заменяць такой жа дранкай, якая была раней. Праект рэканструкцыі вядзецца ў рамках пагаднення паміж міністэрствамі культуры Беларусі і Польшчы. Сродкі выдзяляюцца польскім Міністэрствам культуры і нацыянальнай спадчыны і гродзенскай каталіцкай дыяцэзіяй. Работы вядуць беларускія будаўнікі сумесна з польскімі спецыялістамі.

— Гэта складаны аб'ект, — адзначае Алена Шчасная, — бо ён такі адзін на ўсю Беларусь. Гэта будынак-экспанат. Да таго ж мы павінны даць яму новае прызначэнне і захаваць былую веліч.

Як паведаміў **ксёндз Гродзенскай каталіцкай епархіі Аляксандр САСНОЎСКІ,** у лямусе будзе размешчана музейная экспазіцыя гісторыі Гродзенскай епархіі з розных касцёлаў — кнігі, службовае адзенне святароў, начынне храмаў.

Паступова манастырскаму корпусу будзе вернуты былы выгляд. Прадоўжыцца аднаўленне мураванай агароджы з вежамі па вуглах. Дзве аналагічныя вежы захаваліся на вуглах комплексу па вуліцы Карла Маркса. А вось адзін з будынкаў, прыбудаваны да манастырскай агароджы ў XX стагоддзі, плануецца разабраць. На яго месцы зробяць уезд і ўваход. Сюды змогуць пад'ехаць аўтобусы з турыстамі. Запусцелы ландшафт двара зменіць манастырскі сад. Наведванне музея і тэрыторыі манастыра — праект не камерцыйны, запэўніў ксёндз. І выставы, і лямус будуць даступныя кожнаму наведвальніку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

### У тэму

Брыгіцкі манастыр пабудаваны ў стылі барока ў XVII стагоддзі. Доўгі час насельніцамі яго былі сёстры ордэна шведскай святой Брыгіты. У пачатку XX стагоддзя комплекс перадалі манахіням-назарацянкам. Многія гродзенцы атаясамліваюць будынак манастыра з клінікай для душэўнахворых, якая тут месцілася больш за 40 гадоў. Толькі ў 90-я комплекс вярнулі Гродзенскай дыяцэзіі, пасля чаго апошняя ўзялася за рамонт памяшканняў былой клінікі. Хоць манастырскія памяшканні апусцелі, брыгіцкі касцёл не спыніў сваёй дзейнасці. Дарэчы, гэта адзіны храм у Гродне, дзе службы вядуцца на беларускай, літоўскай, польскай і англійскай мовах. Таксама ёсць служба для глуханямых. Галоўнай святыняй касцёла з'яўляюцца мошчы святога Клімента, рымскага салдата, які загінуў у IV стагоддзі. Доўгі час гараджане лічылі яго нябесным апекуном Гродна.

# Радкі смутку — радкі славы




**У адным паэтычным альманаху сустрэліся паэты Расіі і Беларусі з вершамі пра Вялікую Айчынную вайну.**

У Маскве пабачыў свет спецыяльны выпуск паэтычнага альманаха-навігатара «Паровозъ» — «Бронецягнік Перамогі». Укладальнікі сабралі разам пранізлівыя, шчырыя вершы пра вялікую вайну. Адметна, што сярод іншых твораў — і паэтычныя споведзі творцаў, чый лёс у 1941—1945 гадах быў звязаны з чужбінай. Ёсць і вершы дзяцей вайны. Унікальны кніжны праект рэалізаваны з падтрымкі Саюза расійскіх пісьменнікаў.

Пад адной вокладкай — вершы Іосіфа Уткіна, Ільі Эрэнбурга, Арсенія Таркоўскага, Міхаіла Матусоўскага, Мікалая Грыбачова, Цэзара Саладара, Сямёна Ліпкіна, Васіля Субоціна... Шмат хто з аўтараў ваяваў з фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі. У кнізе — і вершы паэтаў, якія нарадзіліся і жылі ў Беларусі: Анатоля Сафронава, Аляксандра Валодзіна, Дзмітрыя Кавалёва, Уладзіслава Арцёмава, Пятра Кошаля, Міхаіла Шэлехава. Такі «Бронецягнік...» — добры мастацкі падарунак юбілею Вялікай Перамогі ў 2020 годзе. Ёсць яшчэ час і для стварэння беларускай паэтычнай анталогіі ў знак памяці пра пакаленне пераможцаў, пакаленне пакутнікаў і ахвяр. Радкі, створаныя беларускімі паэтамі-франтавікамі Аркадзем Куляшовым, Піменам Панчанкам, Алесем Бачылам, Максімам Танкам, Аляксеем Пысіным, — радкі для вечнасці.

**Сяргей ШЫЧКО.**

## Ну і ну!

# Мінчанін нападпітку пашкодзіў пяць аўто

**Позна ўвечары ў сталічную міліцыю паступіла паведамленне, што на вуліцах Ландэра і Казінца невядомы пашкоджвае аўтамабілі. Праваахоўнікі неўзабаве ўстанавілі асобу зламысніка. Гэта быў 24-гадовы раней судзімы жыхар горада.**

Па інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, у маладога чалавека, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, узнік канфлікт з невядомымі яму людзьмі каля крамы. Падчас высвятлення стасункаў хлопец зняў з сябе заплечнік і кінуў яго ў дзверы гандлёвага аб'екта, разбіўшы шкло. Пасля гэтага ён збег на дваровую тэрыторыю. Менавіта там ён пашкодзіў некалькі аўтамабіляў. Матывы свайго ўчынку малады чалавек растлумачыць не змог. Заведзена крымінальная справа за хуліганства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ХАМАС аб'явіў аб пачатку інтыфады з-за рашэння Трампа па Іерусаліме



Палесцінскі рух ХАМАС абвясціў аб пачатку трэцяй інтыфады, паведаміў прэс-сакратар руху Абдулатыф Алкану.

«Мы абвясцілі аб пачатку трэцяй інтыфады, каб пратэсты працягваліся і каб зрабіць ціск на ЗША, каб яны адмянілі сваё рашэнне. У сектары Газа акцыі пратэсту растуць у рамках пачатку інтыфады. Гэта трэцяя інтыфада», — заявіў Алкану РІА «Навіны». Акрамя таго, адзначаецца, што рух чакае паўтарэння «дня гневу».

Аб поўным спыненні мірнага працэсу на Блізкім Усходзе ХАМАС заявіў пасля таго, як прэзідэнт ЗША Дональд Трамп распарадзіўся аб пераносе пасольства Злучаных Штатаў з Тэль-Авіва ў Іерусалім і прызнаў гэты горад сталіцай яўрэйскай дзяржавы. Лідар руху Ісмаіл Ханія заклікаў палесцінцаў да паўстання.

У Палесціне ўспыхнулі масавыя хваляванні і сутычкі арабскага насельніцтва з ізраільскімі сілавікамі. Пацярпелі сотні людзей. Пачасціліся і выпадкі ракетнага абстрэлу бакамі.

**Інтыфада — арабскі баявы рух, накіраваны на захоп тэрыторыі Палесціны. Першая палесцінская інтыфада — паўстанне палесцінцаў у перыяд з 1987-га па 1991 год, мэтай якога была абвешчана барацьба супраць ізраільскай акупацыі тэрыторый, захопленых у ходзе Шасцідзённай вайны 1967 года. Нагодай для пачатку другой інтыфады стала наведванне прэм'ерам Ізраіля Арыэлем Шаронам і групай ягоных паплечнікаў Храмавай гары ў 2000 годзе.**

## У Польшчы зацверджаны новы ўрад

Сейм Польшчы прагаласаваў за зацвярджэнне новага ўрада краіны на чале з прэм'ер-міністрам Матэвушам Маравецкім.

На мінулым тыдні прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда прыняў адстаўку прэм'ера Беаты Шыдла разам з усім урадам, які працаваў з восені 2015 года пасля перамогі кіруючай у краіне партыі «Закон і справядлівасць» на парламенцкіх выбарах.

Матэвуш Маравецкі ў сваёй праграмнай прамове заявіў, што яго кабінет будзе працягваць сацыяльна арыентаваную праграму партыі і зробіць стаўку на эканамічнае развіццё. Галоўнымі саюзнікамі Польшчы на міжнароднай арэне ён назваў ЗША і НАТА, выступіўшы за пашырэнне супрацоўніцтва з Вышаградскай групай, а таксама Украінай, Грузіяй і Літвой, «калі яны таксама зробяць крокі для выбудоўвання двухбаковых адносін».

## У Японіі назвалі іерогліф — сімвал адыходзячага года

Іерогліф са значэннем «поўнач» стаў сімвалам 2017 года ў Японіі. Інфармацыя была агучаная ў эфіры тэлеканала NHK. Адзначаецца, што гэты выбар звязаны з ракетнымі выпрабаваннямі КНДР, якія выклікалі вялікую занепакоенасць у японцаў. У 2016-м сімвалам стаў іерогліф са значэннем «грошы». Іерогліф «танны» быў сімвалам 2015 года. Сімвалам 2014-га стаў іерогліф «падатак». У 2013-м сімвалам года назвалі іерогліф «кольцы» ў сувязі з тым, што Токіа атрымаў права прыняць Алімпійскія гульні 2020 года.

Іерогліф, які адлюстроўвае найважнейшыя падзеі адыходзячага года, у Японіі называюць з 1995 года.